12. Стаханаўцы сельскай гаспадаркі БССР. *Сацыялістычнае будаўніцтва*. 1937. №1. С. 94–102.
13. ДАГАМВ. Ф. 39. Воп. 1а. Спр. 339.
14. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10782.
15. ЗДА у г. Полацку. Ф. 104. Воп. 1. Спр. 93.
16. ДАВВ. Ф. 932. Воп. 1. Спр. 349.
17. Сацыялістычнае будаўніцтва ордэнаноснай Беларусі: да надзвычайнага XII з’езда Саветаў БССР. Мінск: Дзярж. планавая каміс., 1937. 59 с.
18. Чэтверыкоў В.Н. Як стаханаўцы-калгаснікі Чаўскага раёна атрымалі тону льновалакна з гектара. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1937. 88 с.

* * *

***Тогулева Алена Дзмітрыеўна,***
кандыдат гістарычных навук, дэкан факультэта перападрыхтоўкі кадраў ІПКіПК,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава
(Віцебск, Беларусь**)**

## Пытанне беларускай дзяржаўнасці ў праграмных дакументах Беларускай сацыялістычнай грамады (сакавік – кастрычнік 1917 г.)

Лютаўская рэвалюцыя ў 1917 г. знішчыла царскае самадзяржаўе. Гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расіі, у тым ліку і беларускага. Беларусы, як і астатнія народы Расійскай імперыі, атрымалі надзею дабіцца калі не поўнай незалежнасці, то ва ўсякім разе аўтаноміі. Гэта надзея стала цэнтрам палітычнай барацьбы ў беларускім крае, актывізаваўшы нацыянальна-вызваленчы рух, які ў сваю чаргу з’явіўся састаўной часткай агульна-дэмакратычнай барацьбы беларускіх працоўных.

Беларуская сацыялістычная грамада як першая нацыянальная беларуская партыя ў пачатку XX ст. адлюстроўвала спецыфічна беларускія інтарэсы маладой, яшчэ кволай нацыі, звярталася да беларускага народа на яго роднай мове, выступала за вырашэнне сацыяльных праблем беларускіх працоўных і за ўтварэнне беларускай дэмакратычнай дзяржавы.

Беларуская сацыялістычная грамада аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі. У зварэжнні самадзяржаўя і

ўстанаўленні дэмакратычнага ладу ў Расіі яна бачыла ўмовы для сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення беларусаў. Ужо 25 сакавіка 1917 г. на партыйнай канферэнцыі БСГ прымаецца рэзалюцыя аб падтрымцы Часовага ўрада, за Расійскую федэратыўную рэспубліку і аўтаномію Беларусі ў ёй. Больш падрабязна нацыянальная праграма БСГ была разгледжана на Петраградскай канферэнцыі БСГ у чэрвені 1917 г. Па нацыянальным пытанні БСГ па-ранейшаму бачала Беларусь у складзе Расійскай Федэрацыі і ставіла задачу дамагацца шырокага самакіравання Беларусі з заканадаўчым органам – Краёвай Радай, выбранай на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права; адсутнасці мытных межаў паміж Беларуссю і іншымі часткамі будучай Расійскай Федэрацыі; поўнага палітычнага і эканамічнага раўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі; развіцця нацыянальнай культуры і заканадаўчага прызнання беларускай мовы ў школах, а таксама ў дзяржаўных і грамадскіх установах Беларусі. БСГ выступіла супраць утварэння нацыянальных палкоў [1, с. 3].

14–22 верасня 1917 г. прадстаўнікі Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый прынялі ўдзел у Дэмакратычнай нарадзе, якая адбылася ў Петраградзе. На нарадзе была абвешчана дэкларацыя Цэнтральнай Рады, якую падпісалі Я. Варонка, К.Душэўскі, І. Мамонька, Ф. Фальскі і З. Жылуновіч. У ей выкладалася нацыянальная праграма Беларускай Рады, якая змяшчала аноўныя праграмныя патрабаванні БСГ – дэклараванне федэратыўнай дэмакратычнай Расійскай Рэспублікі з гарантыяй правоў меншасцей, патрабаванне даць магчымасць усім народам Расіі, у тым ліку і беларусам, склікаць свае «представительные Учредительные собрания», дабівацца раўнапраўя моў ў судзе, школе, заснаваць Савет па нацыянальных справах, нацыяналізацыя войска і г.д. [2, арк. 12].

У новай партыйнай праграме, прынятай на III з'ездзе БСГ, які адбыўся 14–25 кастрычніка 1917 г. у Мінску, значных змен па нацыянальным пытанні не было ўнесена. Па-ранейшаму разглядалася заканадаўчае прызнанне беларускай мовы, поўнае самакіраванне (аўтаномія) Беларусі з заканадаўчым органам Краёвай Радай для мясцовага заканадаўства, распрацоўкі і развіцця законаў, якія будуць выдавацца Расійскім парламентам, адсутнасць мытных межаў паміж Беларуссю і іншымі часткамі Расійскай

федэрацыі, поўнае палітычнае і эканамічнае раўнапраўе ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі [3, с. 77]. У дачыненні да стварэння нацыянальнага войска было вырашана наступнае: «III партыйны з'езд БСГ вітае стварэнне беларускай народнай арміі і жадае, каб яна стала рэвалюцыйнай гвардыяй працоўнага народа Беларускага...» [4, арк. 61]. Такім чынам, да кастрычніцкіх падзей ў Петраградзе БСГ (акрамя Віленскай арганізацыі) выступала за федэратыўную дэмакратычную рэспубліку ў Расіі і аўтаномію Беларусі ў яе складзе.

Інакш складваліся абставіны для развіцця беларускага нацыянальнага адраджэння на тэрыторыі, акупіраванай германскімі войскамі. Германскі ўрад з мэтай паслаблення Расіі імкнуўся выкарыстаць і нацыянальнае пытанне. Сустрэўшы на акупіраваных землях не адных палякоў, а і беларусаў, і літоўцаў, і яўрэяў, немцы імкнуліся выкарыстаць гэтую нацыянальную разнастайнасць, каб “раздзяляць і кіраваць”, не дапуская да поўнай перавагі адной нацыі над іншымі. У выніку такой пазіцыі Германіі прадстаўнікі беларускага руху, якія засталіся ў Вільні, а сярод іх былі такія вядомыя дзеячы БСГ як А. і І. Луцкевіч, В. Ластоўскі. А. Пашкевіч і інш. (Віленская арганізацiя БСГ), атрымалі магчымасць шмат зрабіць для развіцця беларускай культуры, мовы і адукацыі.

Адразу пасля прыходу германскіх войск у Вільні адкрыта і легальна пачалася арганізацыя беларускіх народных школ. Займалася гэтай справай Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, што было арганізавана ў красавіку 1915 г. Пры ім была створана школьная камісія, у якую ўваходзілі А. і І.Луцкевіч, Б. Пачобка, А. Пашкевіч і інш. Намаганнямі камісіі 13 лістапада 1915 г. у Вільні  распачала працу першая беларуская пачатковая школа, а ў 1916 г. дзейнічала пяць беларускіх школ (больш за 200 вучняў). Навучанне было бясплатным. Па сведчанню А.Луцкевіча, нямецкае кіраўніцтва г. Вільні ставілася да беларускіх школ так жа, як і да школ іншых нацыянальнасцей: давала субсідыі на выплату жалавання настаўнікам, давала боты і прадукты харчавання для бедных вучняў.

1 студзеня 1916 г. быў выдадзены дэкрэт фельдмаршала фон Гіндэнбурга аб прызнанні беларускай мовы адной з афіцыйных моў на тэрыторыі, акупіраванай германскім войскамі. Гэта актывізавала дзейнасць прадстаўнікоў беларускага руху па арганізацыі беларускага школьніцтва і выдавецкай справы.

Актывізацыя нацыянальнага жыцця выклікала стварэнне ў Вільні каардынацыйнага органа беларускіх палітычных, грамадскіх і прафесійных арганізацый – Беларускага народнага камітэта, які дзейнічаў з 1915 г. па 1918 г. Выдавецтвамі БНК і пад кіраўніцтвам В.Ластоўскага пачалося друкаванне падручнікаў для беларускіх школ. У 1915–1918 гг. было выпушчана 9 кніг: лемантары, чытанкі пасля лементара, задачнікі, кніга А. Луцкевіча “Нашы песняры”, якая з’яўлялася часовым дапаможнікам па гісторыі беларускай літературы і інш. Пачалося выданне на беларускай мове і часопісаў.

У такіх умовах натуральным было з'яўленне пытання аб дзяржаўным афармленні акупіраваных немцамі беларускіх зямель. Спачатку БНК прытрымліваўся канцэпцыі Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага з удзелам беларусаў, палякоў, літоўцаў і яўрэяў. Але Канфедэрацыя не склалася з прычыны вострых супярэчнасцей паміж яе ўдзельнікамі. Польскія памешчыкі і касцёл разгарнулі інтэнсіўную дзейнасць па апалячванню беларусаў. Літоўцы баяліся беларускай большасці ў адной дзяржаве і імкнуліся да сепаратычнага пагаднення немцамі. Гэтыя супярэчнасці былі вынікам палітыкі германскіх улад, якія не жадалі адзінства сярод нацыянальных меншасцей на акупіраваных землях, і тым больш утварэння тут незалежных дзяржаў.

Віленская група БСГ мела свой асобны погляд на будучыню Беларусі. Ва ўніверсале, які быў выдадзены ад імя канферэнцыі Беларускага Народнага камітэта, Беларускай сацыял-дэмакратычнай групы і ВіленскагаКамітэта БСГ у верасні 1917 г., было сказана наступнае: “...Беларусь ад вякоўзвязана з суседнім эканоміка-гаспадарчым арганізмам з Літвой. Іх звязвае супольная арганізацыя і супольныя інтарэсы прамысловасці і таргоўлі, супольныя тарговыя пуці – рэкі і сістэма чыгунак... Разарваць гэтую гаспадарчую еднасць – значыць разбіць самыя асновы эканамічнага жыцця Беларусі і Літвы, значыць засадзіць нас беларусаў у вечную эканамічную залежнасць ад чужынцаў...” [2, арк. 16].

У тым жа верасні 1917 г. у Вільні была надрукавана так званая “Асноўная праграма БСГ”, дзе было запісана наступнае: “...БСГ жадае незалежнасці і непадзельнасці Беларусі і Літвы ў выглядзе дэмакратычнай рэспублікі, абнімаючай усю Беларусь і ўсю Літву – незалежна ад раздзела іх ваенным фронтам...” [5, арк. 15]. Дзяржаўны лад у будучай Беларуска-Літоўскай рэспубліцы павінен быў будавацца на такіх асновах, як перадача ўсёй уласнасці ў рукі

народа; унутранае разгранічэнне Беларускіх і Літоўскіх зямель паводле матчынай мовы жыхароў; роўныя правы для ўсіх нацыянальнасцей края, персанальная аўтаномія для нацыянальных меншасцей; прызнанне ўрадавых праў за ўсімі мясцовымі мовамі; забяспячэнне школьнай навукі ў матчынай мове вучняў“ [5, арк. 15]. Трэба адзначыць, што дзеячы беларускага руху ў Вільні не адмовіліся ад гэтай ідэі, і ў недалёкай будучыні, непасрэдна пад іх уплывам, было прынята рашэнне аб абвяшчэнні незалежнай Беларускай Народной Рэспублікі.

Кастрычніцкія падзеі 1917 г. у Петраградзе выклікалі неадназначную рэакцыю з боку дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Левая частка БСГ (Бабруйская арганізацыя, З. Жылуновіч, І.Серада і інш.) спадзявалася, асабліва пасля выхаду вядомай Дэкларацыі правоў народаў Расіі ад 2/15 лістапада 1917 г., што іх мара аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці ў межах Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай рэспублікі атрымала рэальную падставу. Але яны лічылі, што ў Беларусі да склікання «Чырвонага сейма» павінна правіць «рэвалюцыйная дэмакратыя Беларусі праз Саветы салдацкіх, сялянскіх і рабочых дэпутатаў [6, арк. 187]. Менавіта таму на І Усебеларускім з'ездзе яны выступалі за арганізацыю «беларускіх Саветаў».

Мінская арганізацыя БСГ, Вялікая Беларуская Рада і іншыя беларускія арганізацыі бачылі ў петраградскіх падзеях пагрозу для беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці і таму заклікалі беларускую рэвалюцыйную дэмакратыю «не дапусціць, каб віхор бязладу губіў нашу святую нацыянальную справу абароны вольнасцей і правоў Беларускага Народу...» [7, арк. 22]. Зыходзячы з гэтага, значная частка членаў БСГ разам з прадстаўнікамі Вялікай Беларускай Рады на І Усебеларускім з'ездзе у снежні 1917 г. выступіла за абвяшчэнне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі, арганізацыю з'ездам часовай народнай улады ў Беларусі ў форме рады, якая ў кароткі час павінна склікаць Установчы сход, стварэнне беларускага войска і інш.

Такім чынам, на пачатку XX ст. адбываецца працэс фарміравання беларускага нацыянальнага руху, узнікае першая беларуская нацыянальная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада, беларускае нацыянальнае пытанне выходзіць на палітычную арэну, дзеячы беларускага руху выстаўляюць патрабаванні дзяржаўнага афармлення беларускіх зямель і

дамагаюцца ажыццяўлення сваіх патрабаванняў у складаных палітычных і міжнародных абставінах. Адсутнічае адзіны погляд на дзяржаўнае афармленне Беларусі. БСГ, за выключэннем Віленскай арганізацыі, пасля Лютаўскай рэвалюцыі і да кастрычніцкіх падзей 1917 г. выступала за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі, а Віленскія беларускія дзеячы, якія знаходзіліся на акупіраваных Германскай арміяй тэрыторыях, бачылі будучыню Беларусі ў стварэнні незалежнай Літоўска-Беларускай, а потым Беларускай Народнай Рэспублікі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Пастановы Канферэнцыі БСГ. *Вольная Беларусь*. 1917. 27 ліп. С. 3.
2. НА РБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 81.
3. Программа Белорусской Социалистической Громады (Принята III партийным съездом 14-25 октября 1917 г. в Минске). *Палітычныя партыі Беларусі* : дапам. для вывуч. гіст. Беларусі. Мінск, 1994.
4. НА РБ. Ф. 62. Воп. 3. Спр. 749.
5. ЦДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 139.
6. НА РБ. Ф. 15. Воп. 28. Спр. 10.
7. НА РБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 81.


* * *